На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

№№127–128
(2855–2856)

28 жніўня 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

БЛІЦ

У 2004 годзе кандыдатамі ў дэпутаты вылучаліся 692 грамадзяніны, у 2008-м — 365. Палітычная актыўнасць знізілася амаль у два разы.

Старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына лічыць, што "зніжэнне актыўнасці пры вылучэнні кандыдатаў адбылося з-за натуральных прычын. Гэта не навязаная кімсьці воля, а адпаведнае сацыяльна-палітычнае развіццё грамадства".

Мы вырашылі ўсё ж высветліць меркаванне на гэты конт іншых вядомых людзей і задалі ім пытанне:

Чаму рэзка знізілася колькасць прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат у параўнанні нават з 2004 годам?

Леанід НЕВАР, магчымы кандыдат у дэпутаты па Рэчыцкай акрузе:

— Чаму зменшылася колькасць удзельнікаў выбарчай кампаніі? Таму што людзі разупэўніліся ў тым, што ў Беларусі ўвогуле ёсць выбары. Праз гэты механізм чыноўнікі папросту праводзяць у парламент сваіх людзей. Вось вам прыклад. Нядаўна ў Рэчыцы я сустракаўся з прадстаўнікамі АБСЕ. Напярэдадні сустрэчы са мной яны размаўлялі з кандыдатам ад улады Алай Ісатчанка, якая працуе ў Рэчыцкім райвыканкаме. І яна ўпэўніла прадстаўнікоў АБСЕ, што "праўладнай" не з'яўляецца, што ідзе ў парламент сама па сабе як незалежны кандыдат. Вось такія падманы і адбіваюць усялякую ахвоту ўдзельнічаць у выбарах.

Яўген АГУРЦОЎ, журналіст, балатаваўся ў дэпутаты ў 2004 годзе:

— Удзел у выбарах нагадвае мне сізіфаву працу. Памятаеце, ён усё жыццё каціў камень угору, а той упарта скатваўся... Мой асабісты вопыт упэўнівае мяне ў тым, што перамагчы ў выбарах у сілу свайго розуму, у сілу нейкіх арганізацыйных здольнасцяў проста немагчыма... Расклейка агітацыйных улётак, сустрэчы з выбаршчыкамі ніякага значэння не маюць. У свой час і ўлёткі мае зрываліся, і з выбаршчыкамі мне сустракацца не давалі. Не давалі там, дзе гэта было дазволена кандыдатам ад улады... На мой погляд, пакуль у маленькай Беларусі, якую магчыма за два дні праехаць на ровары, будзе існаваць датэрміновае галасаванне, да той пары падлічыць галасы сумленна будзе проста немагчыма...

Да таго ж мяне абурае і наступная рэч... Нават 10-рублёвая купюра, за якую не набыць нават і пачкі запалак, абаронена вадзянымі знакамі. І гэта правільна, што нават за падробку 10 рублёў можна трапіць за краты. А вось бюлетэні для галасавання ў нас ніяк не абараняюцца. Нават невядома дакладна, якім тыражом яны друкуюцца... І я заклікаю абараніць галоўны дакумент на галасаванні — бюлетэнь, хаця б як 10-рублёвую купюру. Таму што будучыня даражэй за грошы...

А ўдзельнікаў выбарчай кампаніі сёлета менш, таму што людзі не хочуць быць Сізіфамі...

Генадзь АНАНЬЕЎ, экс-кандыдат у дэпутаты па Оршы:

— Адказ вельмі і вельмі просты. Людзі не вераць, што можна перамагчы ў выбарах. Выбараў не было і няма. Калі такая тэндэнцыя ў Беларусі захаваецца, то цалкам верагодна, што ў наступную выбарчую кампанію людзей, якія пажадаюць пазмагацца за дэпутацкія мандаты, стане яшчэ менш...

Аляксей КАРОЛЬ, шэф-рэдактар газеты "Новы час", у свой час балатаваўся ў Маладзечне:

— Выбары ў Беларусі даўно ператварыліся ў інструмент прызначэння ўладай выканаўчай улады заканадаўчай. І таму сацыяльны інтарэс да выбараў зніжаецца, у тым ліку і з боку апазіцыйных сіл. Выбары для апазіцыі проста сталі адным з элементаў супраціву аўтарытарным тэндэнцыям. Маю на ўвазе легальныя магчымасці паразмаўляць з людзьмі, данесці нешта іншае...

Міхаіл ПАШКЕВІЧ, маладзёжны актывіст:

— Як ні дзіўна, з Ярмошынай можна пагадзіцца ў тым, што такі малаколькасны ўдзел у выбарах з боку кандыдатаў ёсць вынік сацыяльна-палітычнага развіцця краіны. 365 кандыдатаў — гэта рэальны зрэз на сённяшні дзень. Нехта добраахвотна адмовіўся ад удзелу, кагосьці не зарэгістравалі, на кагосьці націснулі...

Я хадзіў па хатах падчас збору подпісаў, размаўляў з людзьмі — у многіх апатыя да выбараў. Там на тварах напісана "Байкот", і не варта нічога штучнага ў гэтым сэнсе прыдумваць.

З іншага боку — не ўсе жадаючыя стаць дэпутатам атрымалі магчымасць змагацца за мандат. Маю на ўвазе таго ж Міколу Статкевіча...

Многія, на мой погляд, не хочуць браць на сябе адказнасць удзелу ў гэтай кампаніі, бо ў біяграфіі потым замацуецца, што ўдзельнічаў, але не выйграў... Прычын насамрэч шмат...

Леў МАРГОЛІН, бізнесмен, на мінулых выбарах балатаваўся ў Барысаве:

— Прэтэндэнтаў на мандаты мала, таму што ў краіне няма ніякіх выбараў. Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы насамрэч не вылучалі кандыдатаў у дэпутаты ў Палату прадстаўнікоў. Людзі ад АДС — гэта эксперыментальная каманда, якая павінна пацвердзіць: выбараў у краіне фактычна няма...

Апытанне праводзіў Віталь ГАРБУЗАЎ.

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

Александр КОЗУЛИН:

«Завершив тюремное образование, я стал политиком»

Состоялась первая после освобождения из витебской колонии пресс-конференция экс-кандидата в президенты Александра Козулина.

Политик был отпущен на свободу в субботу, 16 августа. За решеткой Козулин провел 2 года и 5 месяцев. До минувшей среды он отказывался от расширенных интервью для прессы. Исключение Александр Владиславович сделал лишь для "Народной воли". Интервью с политиком было опубликовано в номере за 21 августа.

Сегодня мы предлагаем нашим читателям ответы Александра Козулина на некоторые вопросы, которые были заданы политику во время пресс-конференции 20 августа.

Пресс-конференцию, на которой присутствовало более 100 представителей СМИ, Козулин начал со слов благодарности всем, кто поддерживал его в тяжелые минуты и помог в освобождении из колонии. "Я получал письма не только от жителей Беларуси. Практически нет ни одной страны в Европе, откуда бы не писали мне в колонию, — заявил Козулин. — Шли письма из Канады, США, рекордное число писем — 220 в день".

"Я не могу не высказать признательность Соединенным Штатам Америки, — продолжал политик. — Их твердая и последовательная позиция явилась фундаментом моего освобождения. Я не могу не сказать слов признательности Евросоюзу, лидерам всех стран ЕС, всем, кто активно боролся не только за мое освобождение, но и борется за то, чтобы в Беларуси начались перемены. Без широкой международной солидарности и солидарности белорусской общественности не состоялось бы мое освобождение". "Но, — продолжал Козулин, — мне хотелось бы предостеречь многие международные организации от излишней радости по поводу моего освобождения. Если бы в стране действительно произошли серьезные изменения, я бы сам искренне радовался. Однако говорить об этом еще, видимо, рано", "если бы Лукашенко отпустил меня в период смерти моей жены, то это действительно было бы по-человечески. Однако тогда этого не произошло. Сегодняшнее освобождение — просто закулисная игра с серьезными ставками и серьезными последствиями".

Пресс-конференцию Александр Козулин провел на пятый день после освобождения из колонии. Причину своего молчания он объяснил так: "Козулин сегодня другой. Это не Козулин 2006 года, это Козулин 2008 года. Раньше я не был политиком. Завершив тюремное образование, я стал политиком. И как политик уже не могу торопиться с какими-то выводами, с какими-то заявлениями, с какими-то оценочными суждениями, потому что 2,5 года был оторван от внешнего мира, от всего, что здесь происходит. Делать на эмоциях какие-то выводы было бы неправильно. Я взял паузу, чтобы провести широкий спектр консультаций и встреч. Я встречался с лидерами всех партий, объединений, кроме Александра Милинкевича. С Милинкевичем встречусь в самое ближайшее время. И, конечно же, в эти дни я выполнял свой сыновний долг и провожал в последний путь моего тестя".

"Меня чуть ли не в трусах выталкивали"

— Мне было очень тяжело. Смерть тестя и мое освобождение... Если бы не было этой страшной потери, этой смерти, и мне предстояло выходить на свободу исключительно по указу о помиловании, я бы не принял такого освобождения по морально-нравственным соображениям: я не совершал уголовных деяний. Я не могу принять этого унизительного помилования. Я не виновен, я пострадал только за то, что стал кандидатом в президенты и осмелился сказать правду. И получил пять с половиной лет тюрьмы. Я уже не говорю о тех унижениях и оскорблениях, через которые прошел, не говорю о смерти моей жены, тестя, которые явились следствием этого. ...Я не могу переступать через свои принципы. Я бы не вышел до тех пор, пока бы не были освобождены Андрей Ким и Сергей Парсюкевич. А события тогда развивались очень интересно...

Утром 16 августа меня пригласили в кабинет заместителя начальника колонии и сообщили о смерти тестя. Естественно, я тут же хотел позвонить теще, дочерям, чтобы попытаться поучаствовать в похоронах. Мне заявили, что эти вопросы будет решать начальник колонии... Я сходил в церковь, через полтора часа снова обратился с вопросом об участии в похоронах, мне опять было сказано, что надо ждать начальника колонии. А потом все происходило, как в ускоренном кино.

Замначальника колонии заявил, что у меня полчаса на сборы, я должен собрать ВСЕ личные вещи. Я уточнил: "Все вещи?" Он не ответил, но сказал, что я могу также взять и книги, и фотографии. И я понял, что что-то здесь не так. ...Буквально через две минуты ко мне прибегают и говорят, что у меня не полчаса, а 15 минут на сборы. А еще через пару минут вбегает начальник колонии и заявляет, что уже нет и этих 15 минут. Все сборы заняли максимум минут 8—10. Меня чуть ли не в трусах выталкивали...

Обычно вся процедура занимает много времени, часов 5—6. Оформляется обходной лист, тщательно обыскиваются личные вещи. А здесь все происходило быстро. Меня сразу вывели за пределы зоны, там встретил первый заместитель начальника Департамента по исполнению наказаний МВД Юрий Александрович Варенков и сообщил, что я освобожден в связи с указом президента о помиловании. На что я ответил, что указ этот я не принимаю и подписывать ничего не буду. Но выяснилось, что текста указа у них нет, есть только факс о том, что меня выпускают из колонии...

"Действия господина Левковича — это предательство"

— Сегодня я начинаю с нуля. Снятие меня с должности председателя партии я воспринимаю как знак судьбы о том, что я прощаюсь с прошлым, я завершил свое пребывание в прошлом и избавился от всех проблем, которые были там. Есть такое понятие "круг" — это все или ничего. Это или пустота, или, наоборот, круг, который включает в себя все. Я стал на нулевую отметку, передо мной открыты все дороги.

Я не буду никуда торопиться. Тюрьма учит одному очень хорошему качеству — терпению. Вот сейчас оно у меня появилось.

Я спокойно разберусь, что происходит здесь, какие события происходят в партиях, в том числе и моей партии, и только тогда буду принимать решения.

О членах своей партии я не могу говорить ничего плохого, потому что с ними был связан определенный этап моей жизни. Партия стала частью меня самого. Более того, я желаю всем членам своей партии всего самого хорошего. Конечно же, есть много аспектов того, что происходило. Например, то, что решались вопросы о моем переизбрании с должности председателя партии, когда я был в тюрьме. Но это вопрос не к самой партии, а к отдельным ее представителям.

Действия г-на Левковича — это предательство... Те, кого предают, если они не озлоблены, растут духом, идут дальше. А те, кто предает, — это страшный грех... К Анатолию Иосифовичу Левковичу я отношусь нормально, спокойно, ровно. Конечно же, партия могла принимать такие решения, но съезд был "технический", все было сделано в кулуарах, не был обсужден вопрос на ЦК партии... Но я принимаю это как данность. Однако кому это выгодно? В первую очередь это было выгодно власти. Чтобы Козулин, выйдя на свободу, не имел политической платформы, опоры. Очевидно, что отдельные члены нашей партии сыграли с Лукашенко в одну игру. Какие надо иметь головы, чтобы в преддверии парламентских выборов, когда стоит вопрос об их признании или непризнании мировых сообществом, оппозиция начала грызться?!

"Оппозиция должна быть солидарна"

— Оппозиция должна, как никогда, демонстрировать свое единство, согласовывать свои действия. Оппозиция, как никогда, должна быть осторожна в своих оценках и должна быть солидарна. Скандалы, которые возникали, только на руку режиму. Власть ждет чего? Что Козулин, узнав новость о своем переизбрании, начнет войну и начнет работать обратно на пользу власти. Власть хочет, чтобы была война в оппозиции... Я стремлюсь к кардинальным изменениям в стране. Я буду работать и делать все возможное, чтобы в оппозиции прекратились скандалы, разборки друг с другом, прекратились столкновения. И чтобы сегодня все демократические силы поняли: без единства и консолидации усилий ничего не будет. Конечно, у людей могут быть лидерские политические амбиции, но они должны быть принесены на алтарь Отечества.

"Я буду участвовать в президентской кампании"

— Пару лет до выборов, по белорусским меркам, это огромный срок. За это время может произойти все что угодно. Естественно, я буду участвовать в президентской кампании, вопрос только в том, в качестве кого.

"Уеду ли я куда-нибудь из Беларуси?"

— А как вы полагаете? Вы сами знаете ответ на этот вопрос. Я — сын белорусского народа, и я не могу этого сделать. Я должен пройти весь путь со своим народом. И я знаю, что очень скоро с негативом, который выпал на долю белорусского народа, будет покончено. И как бы ни казалось, что это невозможно, это произойдет. Я верю в это.

"Я для Лукашенко как кошмар, летящий на крыльях ночи"

— Я имею информацию, что в КГБ создано подразделение в количестве 15—20 человек, которые занимаются только Козулиным и его семьей. Я знаю, что вопросы наружного наблюдения, иные аспекты решают не только в КГБ, работает также и Служба безопасности президента. Две спецслужбы заняты Козулиным, и это вызывает большие вопросы!

Знаю: в бытность Жадобина председателем КГБ имелись поводы для заявлений, что я могу подвергнуться физическому устранению. Поэтому я заявлял тогда и заявляю сейчас: у меня нет никаких показаний к инсульту, инфаркту, пищевым отравлениям. Я сегодня осмотрителен, аккуратен и крайне осторожен, поэтому, если я попадаю в какую-то неприятную ситуацию, то ответственно заявляю, она не может быть с моей стороны, эта ситуация будет подготовлена со всей тщательностью спецслужбами.

В отношении того, выгодно это или нет... Понятно, что я для Лукашенко, как кошмар, летящий на крыльях ночи, как совесть, которая приходит к нему ночью и говорит: "Что же ты делаешь?!" Я — не враг Лукашенко, я — его совесть. Я искренне желаю ему добра. И мне искренне жаль, что свой потенциал он использует не во благо народа, а в личных целях.

"В Беларуси царит правовой геноцид и духовный концлагерь"

— Заявления о том, что мой штаб будет требовать от белорусских властей компенсации за мои моральные потери в размере 2 млн евро... От кого бы ни поступали подобные заявления: от моих друзей, соратников, они часто бывают либо не продуманы, либо пиаровские, либо спонтанные. Заявления могу делать только я и моя пресс-служба. Естественно, что мое стремление не в том, чтобы получить деньги, а добиться того, чтобы в Совете по правам человека ООН рассматривался мой вопрос. И он шел в контексте всех последствий, в том числе и компенсации. Но мне эти деньги не нужны, они пойдут на благотворительность. Я хочу публичного обсуждения в ООН проблем белорусской судебной системы.

Сегодня наша судебная система превратилась не в систему справедливых наказаний, а в систему преследования инакомыслящих, тех, кто думает и размышляет. Где презумпция невиновности? ...В Беларуси царит правовой геноцид и духовный концлагерь. И когда спрашивают, а чем мы можем помочь, я отвечаю: белорусы сами справятся со своими проблемами, но вопрос в том, что в стране царит беззаконие. Сделайте для нас самое главное: какой бы плохой закон ни был в нашей стране, пусть он выполняется ВСЕМИ без исключения. А не так, как у нас происходит: судья читает приговор и прячет глаза от того, кому его выносит. А по-другому он не может, потому что сам сядет. Если бы у нас было действительно правовое государство, в стране выполнялись законы, то были бы и партии сильные, и общественные объединения крепкие, и была бы возможность доводить до людей информацию. А эту возможность у нас отобрали. На каком основании?! По какому праву?!

"Дружить мы будем по-честному"

— Что можно говорить о союзном государстве России и Беларуси, о государстве, которого нет?.. Как я могу оценивать перспективы того, чего нет?!.

Сегодня многие говорят о том, что если сильно нажимать на Беларусь, она войдет в состав России, и мы потеряем независимость. Но возможно ли это в принципе при президенте Лукашенко?! Г-н Лукашенко продаст все, что угодно, только не свою личную власть. Для него личная власть — болезнь, главный аргумент в решении всех обсуждаемых вопросов...

Если президентом стану я, Беларусь будет жить очень дружно и с Россией, и с Евросоюзом, и с Соединенными Штатами Америки. И дружить мы будем по-честному...

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

АСОБА

Аляксандр Казулін вылучаны на прэмію Андрэя Сахарава

Польскія дэпутаты пачалі працэс вылучэння Аляксандра Казуліна на прэмію імя Андрэя Сахарава. Еўрапейскі парламент штогод прызначае гэтую прэмію за дзейнасць на карысць правоў чалавека.

Ініцыятарам вылучэння Аляксандра Казуліна на гэтую прэстыжную ўзнагароду з'яўляецца старшыня камісіі Еўрапарламента па кантактах з Беларуссю Яцэк Пратасевіч. Пратасевіч лічыць, што ў Казуліна ёсць сур'ёзныя шанцы атрымаць еўрапейскую ўзнагароду. "Мы сабралі ўжо больш за 30 подпісаў, — заявіў польскі дэпутат у інтэрв'ю Польскаму радыё. — Літаральна апошнія подпісы мы плануем сабраць падчас бліжэйшай пленарнай сесіі Еўрапарламента на пачатку верасня. Найбольш ахвотна падпісваюцца дэпутаты з былых савецкіх рэспублік. Падпісваюцца таксама немцы і галандцы. Адным словам, тыя, хто адчувае, што насамрэч адбываецца ва Усходняй Еўропе, і хто хоча паказаць, што Еўропа адчынена для беларусаў".

Дарэчы, яшчэ адным намінантам на гэтую прэмію сёлета стаў Далай Лама.

Нагадаем, што ўпершыню прэмія Сахарава была прысуджана прадстаўнікам Беларусі ў 2004 годзе. Тады яе атрымала Беларуская асацыяцыя журналістаў. У 2006 годзе лаўрэатам узнагароды Еўрапарламента стаў Аляксандр Мілінкевіч. Летась прэмію атрымаў суданскі абаронца правоў чалавека Саліх Махмуд Асман.

ЧУЛІ?

У Мінск прыедзе Алексій II

Візіт Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Алексія II у Мінск адбудзецца 22--23 кастрычніка. Аб гэтым БЕЛТА паведаміў рэдактар выдавецтва Беларускага экзархата Віктар Папоў.

Паводле яго слоў, Патрыярх прыме ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных святкаванню 1020-годдзя хрышчэння Русі. З удзелам кіраўніка Рускай праваслаўнай царквы будзе арганізаваны "круглы стол", прысвечаны пытанням адраджэння ў грамадстве праваслаўнай веры, маралі і культуры.

ПАРТРЭТНАЯ ГАЛЕРЭЯ

Хрысціянскі выбар Віталя Рымашэўскага

Ён — адзін з тых, хто сёння стварае хрысціянска-дэмакратычны рух нашай краіны. Адначасова ён спрабуе прабіцца ў парламент, каб прынесці хрысціянскія каштоўнасці і ў дзяржаўную палітыку. Знаёмцеся: Віталь Рымашэўскі.

— Што за партыю вы спрабуеце стварыць?

— Мы ўпэўнены, што сучаснае хрысціянства народзіць у Беларусі новы грамадскі рух — хрысціянска-дэмакратычны. І партыю мы бачым толькі як ядро, адну са складовых частак гэтага руху. Відавочна, што Беларусь патрабуе новай палітычнай сілы, якая бы прынесла сюды не толькі праект новага палітычнага ладу, але і праект новай палітычнай культуры. Прынамсі, менавіта ў гэтым наш дэвіз на дзейнасць. Мы спадзяемся, што хрысціяне, якія прыйдуць зараз у палітыку, дадуць узор гэтай новай палітычнай культуры.

Тыя, хто займаецца палітыкай, і асабліва выбарамі, людзі спрактыкаваныя, разумеюць, што часцей за ўсё галасуюць за чалавека. Патрабаванні, якія яны чакаюць, можна сфармуляваць як нейкі стандарты набор — прафесійнасць, сумленнасць, каб чалавек ніколі не хлусіў і быў прыстойных маральна-этычных паводзінаў. Як праваслаўны веруючы, я ведаю, што тым, хто не жыве царквой, вельмі складана такімі быць.

— Наколькі рэлігійныя прынцыпы сумяшчальныя з палітыкай? У нас прынята іх нейкім чынам падзяляць.

— Любы святар з любой (праваслаўнай, каталіцкай, пратэстанцкай) царквы пацвердзіць тыя словы, якія я зараз скажу. Хрысціянства ў нейкім сэнсе гэта не рэлігія. Хрысціянства — гэта жыццё. Чалавек у нармальным выпадку, калі ён хрысціянін, не можа падзяляць сваё жыццё на бізнес, царкву, дом, палітыку і г.д. Інакш вера ператварыцца ў культ. Гэта не магія, не карты Таро. Гэта жыццё. Калі чалавек веруючы, то ён павінен паводзіць сябе як веруючы ва ўсім. У тым ліку і ў палітыцы. Гэта адна са сфер чалавечага жыцця.

Хрысціяне, безумоўна, павінны займацца палітыкай, і на Захадзе безліч гэтаму прыкладаў. Можна сказаць, што хрысціянская дэмакратыя пасля другой Сусветнай вайны адрадзіла Еўропу, а хрысціянскія дэмакраты стварылі яе сучасны твар. У назве многіх партый ёсць гэтыя словы, а ў Нямеччыне хрысціянскія дэмакраты зараз пры ўладзе і за іх галасуюць ужо традыцыйна.

Калі ў чалавека ёсць пакліканне займацца палітыкай, то ён проста павінен ёй займацца, служыць на тым месцы, дзе прызначыць Бог.

— Чуў, што вы займаліся бізнесам?

— Так. І шмат разоў хацеў адкрыць тут, у Беларусі, сваю справу. Адразу пасля палітэха займаўся шмат чым, у тым ліку і аўтабізнесам, які быў звязаны з Еўропай. Працаваў у адным сумесным прадпрыемстве загадчыкам тэхнічнага аддзела.

Але я заўсёды меў на працы праблемы, звязаныя з палітыкай. Асабліва гэта тычылася дзяржаўных структур. У мяне былі добрыя стасункі з дырэктарамі і, калі пачыналіся выбары, яны мяне проста прасілі часова сысці.

І аднойчы зразумеў, што ў сённяшняй Беларусі паралельна займацца палітыкай і бізнесам немагчыма. А зараз гэта для мяне галоўнае. Таму вымушаны працаваць за мяжой. Сёння я — галоўны эканаміст адной маскоўскай фірмы. Дарэчы, мае абавязкі непасрэдна звязаны са стварэннем тут менавіта хрысціянска-дэмакратычнай партыі. Мы спрабуем сабраць разам людзей, якія маюць эканамічную адукацыю, займаюцца бізнесам альбо займаюць нейкія пасады ў дзяржаўных структурах. Гэтая група людзей будзе займацца распрацоўкай праграм эканамічных рэформ для Беларусі. Мы пачалі работу ў бягучым годзе і праз год плануем стварыць хрысціянскі навукова-даследчы эканамічны інстытут.

Зараз у Беларусі вельмі шмат таленавітых маладых людзей — бізнесоўцаў, менеджэраў, эканамістаў, не задаволеных рэжымам і існуючай сітуацыяй, але яны, на жаль, не ў апазіцыі. І гэта зразумела — сёння адкрыта супрацьстаяць уладзе вельмі цяжка. Асабліва тым, хто займаецца бізнесам. Мы хочам прыцягнуць гэтых людзей да распрацоўкі праграм эканамічных рэформ. Прычым гэта будуць не тэарэтыкі, хоць у іх і ёсць эканамічная адукацыя, а практыкі, тыя, хто непасрэдна займаецца бізнесам альбо займае высокія пасады. Мая праца сёння звязана менавіта з гэтым.

— Можа, не патрэбна бізнесменам палітыка? У адрозненне ад іншых ім ёсць, што губляць…

— Павінен адзначыць, што зацікаўленасць да сённяшняй палітыкі, выбарчых кампаній у большасці бізнесменаў вельмі нізкая. Хаця пры ўмове, што ў нас былі б дэмакратычныя, сумленныя выбары, сітуацыя была б зусім іншай. Ведаю некалькіх людзей, якія мне адкрыта казалі: калі б былі рэальныя шанцы прайсці ў парламент, мы гатовы ўкладваць грошы ў тваю ці кагосьці іншага выбарчую кампанію. У прынцыпе, бізнес прызнае вартасць улады у магчымасці вырашэння праз уладу пытанняў, важных дзеля бізнесу. Аднак яны абсалютна не вераць, што легальным шляхам можна нешта змяніць. Слушнае перакананне, бо ў нашых умовах трапіць у беларускі парламент незалежным кандыдатам немагчыма ўвогуле.

Канешне, ёсць "свае" бізнесмены, якія праходзяць у Палату прадстаўнікоў без праблем. Іх прозвішчы добра вядомыя. Аднак гэтых людзей на сто працэнтаў нельга назваць незалежнымі палітыкамі.

Прыналежнасць да ПП надае кожнаму чалавеку дадатковы статус, таму ад яго ніхто б не адмовіўся, але сумленна туды трапіць немагчыма.

Хачу таксама дадаць, што сярод сяброў аргкамітэта па стварэнні партыі "Беларуская хрысціянская дэмакратыя" ёсць бізнесоўцы, якія адкрыта выказваюць да нас свае сімпатыі.

— І не баяцца?

— Не толькі не баяцца, але на мінулых выбарах у Палату прадстаўнікоў яны нават балатаваліся. І на самай справе перамаглі, аднак ніхто з іх у ПП не трапіў. Гэта было вялікае расчараванне, за якім у некаторых з іх пачаліся і праблемы з бізнесам.

— Тады такое пытанне. Навошта людзі лезуць туды, дзе абавязкова атрымаюць удар па носе? Аб гэтым неаднаразова казаў і сам Лукашэнка.

— Тут права на выбар мае кожны. Некаторыя яшчэ да гэтага часу спадзяюцца, што, калі яны не будуць ісці ў палітыку, не будуць і атрымліваць па носе. Аднак многія даўно зразумелі і іншае — удары будуць незалежна ад палітычных прыярытэтаў.

У нас, у Беларусі, амаль ніхто палітыкай па добрай волі не займаецца. І тыя ж самыя прадпрымальнікі, якія выйшлі ўзімку на плошчу, не выключэнне. Нельга сказаць, што яны былі адной з самых актыўных палітычных сіл. Проста яны заміналі пэўным эканамічным кланам. Таму іх і вырашылі ліквідаваць як клас. Пратэсты ўлада справакавала сама. Прадпрымальнікі выйшлі на плошчу па эканамічных, а не палітычных прычынах.

Тое ж самае можна сказаць і пра хрысціянскія канфесіі. Так, улады кажуць, што царква не павінна займацца палітыкай і ніхто яе чапаць не будзе. Хлусня. Пратэстанты і каталікі могуць пацвердзіць, што гэта не так. Перманентная высылка ксяндзоў, закрыццё цэркваў, немагчымасць працаваць з вернікамі. Людзі адчулі, што іншага выйсця проста няма, вырашылі бараніць свае інтарэсы, у тым ліку і палітычным чынам. Таму рэпрэсіі з боку ўлады становяцца каталізатарам палітызацыі грамадства.

Зноў-такі, што датычыцца прадпрымальнікаў, то не памылюся, калі скажу: дзевяноста працэнтаў з іх гатовы падтрымаць новыя палітычныя сілы. Не таму, што яны палітызаваныя, а таму, што ўмовы іх працы такія, што падатковая інспекцыя практычна без падстаў можа ўваходзіць у офісы і правяраць фірмы, кожны з іх "задушаны" падаткамі і трымаецца "на валаску", не можа нармальна існаваць. Многіх гэта ўжо дастала.

Думаю, сёння ўсе зразумелі, што нават блізкасць да ўладных структур, адміністрацыі, Лукашэнкі не гарантуе асабістай бяспекі і бяспекі бізнесу. Апошняя кадравая ратацыя сведчыць аб гэтым даволі красамоўна. Дадаць можна і крымінальную справу былога кіраўніка рынку "Ждановічы".

— А з чым да выбаршчыкаў ідуць бізнесмены-хрысціяне?

— Мая задача ўдзелу ў выбарах — перш за ўсё распавесці пра хрысціянскую дэмакратыю, расказаць пра тое, што ёсць новая генерацыя, якая будзе займацца рашэннем праблем, якія непакояць людзей, абараняць іх інтарэсы. Такі вопыт ўжо ёсць. У маёй акрузе месціцца царква "Новае жыццё". Калі вакол яе адбываліся вядомыя падзеі, мы былі аднымі з арганізатараў кампаніі ў абарону царквы і сабралі больш за 50 тысяч подпісаў за змены ў Закон аб свабодзе сумлення. Мы будзем казаць: многія недарэчнасці абумоўлены тым, што ўлада нікім не кантралюецца, бо ў Беларусі няма сумленных выбараў, і хочам гэта кардынальна змяніць. Мы будзем запрашаць людзей далучацца да нашай кампаніі, ісці ў мясцовыя выбарчыя камісіі, быць назіральнікамі. Тлумачыць: многія праблемы сучаснай Беларусі звязаны з тым, што ў нас няма свабоды. Свабоды бізнесу, а дакладней, сапраўднай канкурэнцыі. Наша праграма — стварыць для бізнесу спрыяльныя ўмовы, спыніць развіццё кланавага бізнесу, аднавіць законнасць. Людзям гэта проста патлумачыць практычна: каб знізіць кошты на кватэры ў Мінску, патрэбна свабода для бізнесу — стварыць роўныя ўмовы, магчымасці для ўдзелу ўсіх кампаній у забудове. Сёння ў Мінску будоўляй займаецца толькі некалькі манапалістаў.

Наша праграма — свабода для цэркваў і грамадскіх аб'яднанняў. Калі дазволіць цэрквам актыўна працаваць з людзьмі — у нас будзе менш абортаў і наркаманаў, таму што ў іх ёсць выдатныя рэабілітацыйныя праграмы па вывадзе тых жа наркаманаў з наркатычнай залежнасці, ёсць паспяховы вопыт працы з цяжкімі падлеткамі і інвалідамі...

У Беларусь павінна прыйсці свабода для цэркваў і забарона для сект. На сённяшні дзень усё наадварот. Секты дазволены (усялякія майстры Таро і гаданні па тэлебачанні), а цэрквы працаваць не могуць.

Яшчэ адзін з пунктаў нашай праграмы — сумленныя, справядлівыя выбары без фальсіфікацыі і кантроль над уладай. Для таго каб сітуацыя ў Беларусі змянілася, трэба зменшыць карупцыю, стварыць для людзей спрыяльныя ўмовы для працы, а гэта немагчыма без кантролю над уладай. Калі выбары фальсіфікуюцца, а дэпутаты прызначаюцца — то якім чынам яны могуць бараніць інтарэсы народа? Таму мы актыўна падтрымліваем кампанію "За сумленныя выбары".

— "Кантроль" гучыць вельмі добра, але ў рэальнасці адбываецца зусім іншае. Людзі, напрыклад, не ведаюць, адкуль на самай справе ідуць тыя ж замежныя інвестыцыі.

— На жаль, зараз праводзіцца тайны продаж прадпрыемстваў. Тое, чым беларуская ўлада так ганарылася апошнія 10 год, дзяржаўная маёмасць, негалосна перадаецца ў прыватныя рукі. У прынцыпе, сам працэс прыватызацыі можна было б назваць станоўчым, калі б ён праходзіў па-іншаму, на канкурэнтнай аснове, каб перавага не аддавалася толькі расійскаму капіталу. Напэўна, расійскі бізнес не самы лепшы і чысты, бо ён заўсёды звязаны з мясцовай карупцыяй. Па вялікім рахунку ніхто не ведае пра нейкія тэндэры, праз якія прадаюцца беларускія прадпрыемствы. Ужо заўтра і заводы, і нерухомасць Мінска будзе належаць новым маскоўскім і беларускім алігархам. Гэта і тлумачыць тое, чаму Мінск забудоўваецца так безгустоўна і чаму новыя мінскія дамы так падобны на маскоўскія. Беларуская сталіца прымітыўна нявечыцца. Акрамя расійскіх, ніякіх іншых інвестыцый амаль няма, хаця Захад гэтага бы вельмі хацеў. Для іх не створаны ні палітычныя, ні эканамічныя ўмовы.

Ва ўсіх краінах назіраецца баланс інвестыцый, а ў Беларусі яго няма. Улада хавае сапраўдныя лічбы, але я ўпэўнены, што там восемдзесят працэнтаў — расійскія грошы, а гэта азначае, што ў будучым мы будзем залежаць толькі ад іх капіталу. Каб захаваць сваю незалежнасць, трэба мець у гэтай галіне парытэт.

— Тады апошняе пытанне. Вы размаўляеце па-беларуску. Як гэта ўспрымаецца людзьмі?

— У Мінску большасць людзей успрымае беларускую мову вельмі станоўча. Падчас папярэдніх выбарчых кампаній, мы прасілі нашых зборшчыкаў подпісаў размаўляць на той мове, якую ўжываюць тыя, хто ставіць подпісы.

Але потым высветлілася, што тыя валанцёры, якія заўсёды размаўлялі з жыхарамі па-беларуску, сабралі подпісаў болей за астатніх. Мінчане вітаюць беларускую мову, і даўно ведаюць , што па-беларуску размаўляюць не толькі сябры Партыі БНФ. Таму, я перакананы, што і беларускую мову, і хрысціянскія каштоўнасці людзі будуць успрымаць добра.

Аляксандр ТАМКОВІЧ.
Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.

ДАВЕДКА

Віталь Рымашэўскі нарадзіўся 3 сакавіка 1975 года ў Бабруйску. Бацька — будаўнік, маці — інжынер па транспарце. Скончыў сярэднюю школу і паступіў на будаўнічы факультэт Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі. Пасля сканчэння вучобы працаваў у розных структурах, пераважна ў галіне маркетынгу.

Жанаты.

З 1996 года займаецца палітыкай. Адзін з заснавальнікаў "Маладога фронту".

З 2006 года сустаршыня аргкамітэта па стварэнні партыі "Беларуская хрысціянская дэмакратыя".

У шасці акругах ёсць толькі кандыдат улады

У шасці выбарчых акругах вылучыліся толькі па адным прэтэндэнце на дэпутацкі мандат. Пра гэта паведаміў сакратар Цэнтрвыбаркама Мікалай Лазавік.

Паводле яго слоў, гэта Івацэвіцкая акруга № 11, Пінская сельская № 15 (Брэсцкая вобласць), Наваполацкая №25 (Полацкі раён Віцебскай вобласці), Ваўкавыская №48, Навагрудская №57 (Гродзенская вобласць) і Маладзечненская сельская №71 (Мінская вобласць). Найбольшая колькасць прэтэндэнтаў у Мінску, дзе па некалькіх акругах вылучаецца па сем чалавек.

Кандыдаты выходзяць у эфір

Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў зацвердзіла графік выступленняў кандыдатаў у дэпутаты ў тэле- і радыёэфіры.

Член Цэнтрвыбаркама Надзея Кісялёва паведаміла, што кандыдаты будуць выступаць па тэлебачанні і радыё з 3 па 19 верасня. Адмысловы графік прадугледжаны ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях з-за асаблівасцяў тэлевізійнага вяшчання на іх тэрыторыях. У Брэсцкай вобласці выступленні будуць праходзіць 4, 8, 10, 12, 15, 17 і 19 верасня, у Гродзенскай — 3, 5, 9, 11, 16 і 18 верасня.

Выступленне кандыдата працягласцю не больш за пяць хвілін будзе даваецца ў запісе: па радыё — ад 18.00 да 19.00, па тэлебачанні — ад 17.30 да 18.30. У адзін дзень будуць перадаваецца выступленні ўсіх кандыдатаў адной акругі. Тэлебачанне і радыё будуць загадзя інфармаваць выбаршчыкаў аб парадку выступленняў кандыдатаў.

Кандыдатам, зарэгістраваным у акругах Мінска і Мінскай вобласці, эфірны час будзе даваць радыёстанцыя "Сталіца", астатнім — абласныя радыёкампаніі. Тэлевізійныя выступленні кандыдатаў з Мінска будзе трансляваць тэлеканал "Лад", кандыдатаў з Мінскай вобласці — СТБ, астатніх кандыдатаў — абласныя тэлерадыёкампаніі.

ПЕРЕКРЕСТОК МНЕНИЙ

Мистификация

Оппоненты власти утверждают: в Беларуси "элегантные победы" во всех избирательных кампаниях куются, как правило, избирательными комиссиями. Представители власти отвергают все обвинения и настойчиво твердят про честность и открытость подсчета голосов. Казалось бы, в чем спор? Ведь камень преткновения — избирательные бюллетени. Сколько их, кто и как контролирует их количество и подсчет голосов?

Сегодня мы решили это выяснить.

В интервью "Народной газете" председатель Центральной комиссии по выборам и проведению республиканских референдумов **Лидия Ермошина** сказала: "У нас создано два мифа: досрочное голосование и непрозрачные урны. Что касается пластиковых урн, то они у нас применяются, но там, где орган, оборудующий участок, имеет деньги... Школы не обладают такими средствами и пользуются тем, чем пользовались всю жизнь... Миф о пластиковых урнах создан исключительно на просторах СНГ. Те, кто педалирует эту тему, не хотят обращать внимания на простейшее — ведь через стекло видно только количество бумаги, но не содержание документов".

Секретарь Центральной комиссии по выборам и проведению республиканских референдумов **Николай Лозовик** считает, что *"проблем при изготовлении бюллетеней не было и не будет"*.

"Форма бюллетеня Центризбиркомом утверждена, в соответствии с ней даются заказы на их изготовление, — говорит Николай Иванович. — Заказы будут размещать окружные избирательные комиссии. Количество бюллетеней традиционно делается с небольшим запасом, не более 10 процентов. На всякий, как говорится, пожарный случай — что-то может случиться на участке, какое-то стихийное бедствие произойдет и потребуется заменить комплект бюллетеней и доставить новые... Мы как-то не ставили никогда вопрос о наблюдении за изготовлением бюллетеней и полагаем, что если международные наблюдатели захотят присутствовать при этом, мы такую возможность предоставим.

Председатель юридической комиссии политсовета Объединенной гражданской партии, специалист по избирательному праву **Сергей Альфер**:

— Окружная комиссия не является юридическим лицом, поэтому заказ на изготовление бюллетеней делается соответствующими исполкомами и районными администрациями, на счетах которых находятся деньги. Из-за того, что за процессом изготовления избирательных бюллетеней нет должного контроля, возникают разные подозрения. Конечно, в заявке можно написать, что, мол, необходимо изготовить столько-то бюллетеней (примерно 70 тысяч на один округ плюс 10%). Но сколько изготовлено на самом деле? До сих пор это никто и не контролировал. (Замечу, бюллетени у нас печатаются на обычной бумаге, у них нет никакой степени защиты.) Затем бюллетени передаются в окружные и участковые комиссии. Они, находясь в полной зависимости от местных органов власти, вполне могут получить дополнительно, без документального оформления, намного больше 10-процентного уровня бланков, которые затем можно использовать "по усмотрению".

Во всех странах данный процесс происходит под достаточно жестким контролем оппозиционно настроенных членов избиркомов, наблюдателей. В наших условиях, убежден, это тоже крайне необходимо. Кроме того, можно было бы ввести в практику печатание бюллетеней с отрывными номерными корешками, как в Латвии, (хотя, думаю, и тут власти предержащие смогли бы найти выход, сделав двойную нумерацию).

В любом случае проблема упирается в комплектование избирательных комиссий, которые были бы в большой степени независимы от местных органов власти.

Почетный председатель БСДП Александр Козулин:

— Я сегодня говорю: давайте сделаем подарок ЦИК и купим прозрачные урны. Это очень важно! За пять дней досрочного голосования в непрозрачных урнах ночью можно поменять все, что хочешь... Достаточно вбросить от 10 до 20 процентов бюллетеней, и они решат ситуацию в пользу любого кандидата в депутаты. А прозрачные урны исключают такую возможность, потому что можно вечером и следующим утром сфотографировать эти урны. Ермошина говорит, что нет средств на их приобретение. ОБСЕ и США, сделайте ЦИК подарок!

Сергей Альфер:

— В нашей ситуации, безусловно, нельзя будет проследить за процессом подсчета голосов при досрочном голосовании, ибо порядок здесь таков, что можно спокойно заменить сто процентов бюллетеней. Однако непосредственно в день голосования наблюдателям надо проявить жесткость — при подсчете голосов находиться не далее 2—3 метров и не мешать этому процессу, контролируя его, видя содержание бюллетеней. Что же касается приобретения прозрачных урн, то, убежден, есть такие вещи, на которые нельзя жалеть денег. Действительно, если бы средства попросили у международного сообщества, они были бы предоставлены. Ведь, если говорить о фальсификации, коль в урну будет вброшена пачка бюллетеней, сразу станет видно, что есть что.

А вообще, по моему глубокому убеждению, нынешние выборы будут полностью сфальсифицированы органами власти.

***

Получается, как здесь ни крути, на всех этапах подсчета голосов инсинуации возможны. Неужели действительно выборы уже сделаны?..

Игорь ГРИШАН.

Прадстаўнікі 25 дзяржаў ужо назіраюць за беларускімі выбарамі

Доўгатэрміновы маніторынг парламенцкіх выбараў у Беларусі на гэты час праводзяць 89 міжнародных наглядальнікаў з 25 дзяржаў.

Міжнародныя наглядальнікі прадстаўлены трыма структурамі: 30 чалавек ад СНД, 5 — ад Міжпарламенцкай асамблеі СНД, 54 — ад БДІПЧ АБСЕ. Доўгатэрміновыя наглядальнікі сочаць за работай выбарчых камісій, выкананнем норм заканадаўства, за сродкамі масавай інфармацыі пры правядзенні перадвыбарнай агітацыі і прапаганды.

Пад наглядам?

Восем палітычных партый накіравалі сваіх прадстаўнікоў у склад ЦВК з правам дарадчага голасу. Аб гэтым было заяўлена на пасяджэнні Цэнтрвыбаркама Беларусі.

Сваіх прадстаўнікоў у склад ЦВК, у прыватнасці, накіравалі Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці (Віктар Сакалоў), Камуністычная партыя Беларусі (Георгій Атаманаў), Ліберальна-дэмакратычная партыя (Наталля Мацяйковіч), Беларуская аграрная партыя (Эдуард Калінін), Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) (Іван Лабачоў), Партыя камуністаў Беларуская (Алена Скрыган), Аб'яднаная грамадзянская партыя (Уладзімір Раманоўскі), Партыя БНФ (Галіна Сямдзянава). Сем прадстаўнікоў партый, за выключэннем Івана Лабачова, ўжо ўзялі ўдзел у пасяджэнні Цэнтрвыбаркама.

НУ І НУ!

Дэфіцыт месцаў для агітацыі

Гродзенскі гарадскі выканаўчы камітэт вызначыў месцы для размяшчэння друкаваных матэрыялаў на рэкламна-інфармацыйных тумбах і стэндах. Паводле гэтага рашэння, напрыклад, у Кастрычніцкім раёне горада, вызначана толькі чатыры месцы для размяшчэння такой агітацыйнай прадукцыі. Яўна, што кандыдатам у дэпутаты будзе недастаткова выдзеленых стэндаў, каб давесці сваю праграму да выбаршчыка.

Няўжо такі дэфіцыт плошчаў у горадзе над Нёманам? Ці ўлады ўвогуле не хочуць, каб грамадзяне хоць што-небудзь ведалі пра патэнцыйных кандыдатаў?

Агитация за кандидатов власти началась?

В минувшие выходные прошел мини-концерт на дворовой территории жилых домов у Черноморского рынка Гомеля, относящейся к 35-му избирательному округу, по которому выдвигается руководитель администрации Советского района Татьяна Филимончик. "Закатила" концерт администрация Советского района.

Ведущие, открывая мероприятие, заявили, что праздник приурочен к 35-летнему юбилею района, который будет праздноваться только. 20 сентября.

На этом мероприятии присутствовала и претендент на депутатский мандат Татьяна Филимончик. Ведущие концерта произнесли коллективную благодарность за крыши, которые не текут, за дороги, по которым безопасно ездить, и за эстетическую красоту района, которым она руководит. Затем Татьяна Филимончик вручила грамоты представителям особо "заслуженных" жилищных организаций и подробно рассказала гражданам о достижениях своей администрации.

Не правда ли, все это очень напоминает предвыборную агитацию? Причем за государственный счет.

Всплыл

Главный президентский кадровик Владимир Синяков решил попытать депутатского счастья и баллотируется по Молодечненскому сельскому избирательному округу №71.

Кандидатом в депутаты Синякова выдвинули трудовые коллективы ГОЛХУ "Воложинский опытный лесхоз" и ВРУП "Березинское".

"Раней пакаранне за такія злачынствы прызначалася ў рамках ніжняй санкцыі артыкула — гэта значыць штрафы былі мінімальныя. Але такія меры пакарання ніякім чынам не ўплывалі на сітуацыю, таму калегія Генеральнай пракуратуры прыняла рашэнне зрабіць спагнанне з п'яных вадзіцеляў больш жорсткім, аж да канфіскацыі машыны на стадыі расследавання", — пракаментаваў А.Змушко.

У пракуратуры Гомельскай вобласці дадалі, што за апошнія сем месяцаў да крымінальнай адказнасці за паўторнае кіраванне транспартным сродкам у нецвярозым стане былі прыцягнуты 370 жыхароў рэгіёна. Напрыклад, Жыткавіцкі раённы суд аштрафаваў п'янага вадзіцеля на 500 базавых велічынь.

Алена ГЕРМАНОВІЧ.

ПАЗІЦЫЯ

Антон АСТАПОВІЧ: «Яны проста прыкрываюцца прыбіральняй!»

Камітэт архітэктуры і горадабудаўніцтва, Мінгарвыканкам і Міністэрства культуры Беларусі ўзгаднілі праект будоўлі ў Купалаўскім парку кавярні на 100 месц.

"Мінскград" сцвярджае, што ўмяшальніцтва ў экалагічную структуру парку будзе зведзена да мінімуму. Аднак Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры не згаджаецца і настроена катэгарычна супраць пабудовы.

Таварыства падрыхтавала ўжо тэкст ліста на імя А.Лукашэнкі, подпісы пад якім будуць збірацца сярод мінскай інтэлігенцыі. Таксама таварыства будзе звяртацца ў кантрольна-рэвізійныя і праваахоўныя органы для "навядзення парадку".

Кіраўнік Беларускага рэспубліканскага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч, у якога на руках знаходзіцца копія генеральнага плана праекта кавярні, сцвярджае, што будаўніцтва кавярні на месцы ўжо існуючых пабудоў — пыл у вочы грамадства.

"Так, у парку існуе пабудова — гэта паркавая прыбіральня, — кажа Астаповіч. — Але ж толькі ўявіце суразмернасць паркавай прыбіральні і кавярні на 100 пасадачных месц... Так што яны проста прыкрываюцца прыбіральняй!

Прыбіральня, згодна з планам, будзе знесена і на яе месцы будзе поўнасцю новы будынак. Прыбіральню кавярні збіраюцца размясціць на падземным ярусе... Я не думаю, што прыбіральня, разлічаная на наведвальнікаў кавярні, будзе адчынена для наведвальнікаў парку. Нават такое трывіяльнае пытанне, як схадзіць па патрэбе — ужо здымаецца ў наведвальнікаў парку..."

Антон Астаповіч лічыць, што будаўніцтва кавярні не проста пагражае камфорту мінчан, але стане прычынай знішчэння Купалаўскага парку наогул.

"Купалаўскі парк — гэта гісторыка-культурны аб'ект, каштоўнасць другой катэгорыі, — тлумачыць Астаповіч. — І ён будзе руйнавацца: высекуцца дрэвы, арганізуюцца тэхнічныя праезды, будзе фрагментарна ліквідавацца літая, 50-х гадоў мінулага стагоддзя, чыгунная агароджа...

Да таго ж побач з паркам — Свіслач, гэта значыць — блізка знаходзяцца грунтовыя воды. Любое падземнае будаўніцтва патрабуе прымусовага адпампоўвання вады — паніжэння ўзроўню грунтовых вод. Гэта прывядзе да хвароб дрэў і ўсыхання ўсяго парку..."

Усе рашэнні прымаліся без уліку меркаванняў аўтараў рэканструкцыі Купалаўскага парку і "Зеленбуду", які рэзка выступіў супраць гэтага праекта. А галоўнае — парушана заканадаўства.

"Ёсць беларускае заканадаўства, у прыватнасці, Закон аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, — адзначае Астаповіч. — Кавярня ставіцца ў паркавай, гісторыка-культурнай, нават водаахоўнай зоне, што парушае шэраг нарматыўна-прававых актаў. Чаму наша паважаная навукова-метадычная рада пры Міністэрстве культуры па ахове гісторыка-культурнай спадчыны дае ўзгадненне на гэтае будаўніцтва?..

Мы можам абмяркоўваць плюсы і мінусы праекта. Але ж я лічу, што гэта можна рабіць толькі, калі кавярня будзе будавацца ў Шабанах ці ў Малінаўцы, а не на тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці — ландшафтна-прыроднага куточку парку, у водаахоўнай зоне".

Вольга ПРУДНІКАВА.

КРЫМІНАЛ

Ляснула «залатая жыла»

Ледзь ці не паўсотні месцічаў райцэнтра Гарадок на Віцебшчыне давядзецца паклікаць у суд па крымінальнай справе, фігурантамі ў якой будуць дзве родныя сястры -- старэйшая, жыхарка Гарадка, сціплая рабочая племстанцыі Яніна Васілёнак і малодшая, Алена Томаш, якая стала пражывала ў Гродне і часцяком наведвала польскі Беласток, дзе, карыстаючыся тамтэйшымі гандлёвымі рэаліямі, набывала залатыя вырабы нявызначанай вытворчасці, завезеныя ў краіну кантрабандным шляхам.

Згубную ідэю стварыць невялічкую, на дзве персоны, кампанію па перапродажы ў Гарадку набытага ў Польшчы золата Алена прапанавала Яніне ў якасці хуткага выйсця з нішчымніцы, у якой, на думку Алены, знаходзілася яе старэйшая сястра ў Гарадку. Яніна пагадзілася, і на працягу ўсяго 2007 года тэлефон у яе кватэры амаль штохвіліну прымаў замовы на залатыя ўпрыгажэнні, якія прадаваліся адносна танна -- па 27 долараў ЗША за грам. Праўда, на кожным граме сёстры мелі прыбытак у 4 долары, бо ў Польшчы золата каштавала яшчэ танней. Вырабы збываліся ў акуратных поліэтыленавых пакуначках, да іх прыкладаліся фальшывыя этыкеткі нейкай расійскай ювелірнай фірмы.

Гарадоцкі "клондайк" буяў, попыт нарастаў, і Яніна Васілёнак пачала весці бухгалтарскі ўлік: запісвала ў спецыяльныя нататкі адрасы, прозвішчы і нумары тэлефонаў сваёй кліентуры, што ў далейшым дужа спрасціла следчым раённай пракуратуры пошук сведак.

А пракуратура зацікавілася "клондайкам" даволі хутка: гандлёвы ажыятаж вакол "залатой жылы" не мог не прыцягнуць увагу спецыяльных органаў, бо сёстры, задаволена падлічваючы прыбыткі, забыліся на тое, чаго няма ў Польшчы, а ёсць у Беларусі -- 233 артыкул Крымінальнага кодэкса, дзе прадугледжана адказнасць за незаконныя гандлёвыя аперацыі з каштоўнымі металамі. Так што ў выніку судовага працэсу, які неўзабаве мае адбыцца ў Гарадку, Яніна Васілёнак і Алена Томаш рэальна могуць атрымаць ад 3 да 8 год турмы.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Крымінал на могілках

Пракурорская праверка выявіла шматлікія парушэнні з боку працаўнікоў могілак і спецкамбінатаў краіны.

Высветлілася, што яны атрымліваюць хабар за аказанне паслуг па пахаванні і перапахаванні. Такія факты выяўлены ў Віцебску, Рэчыцы, у Цэнтральным раёне Мінска. Па дадзеных фактах распачаты крымінальныя справы.

Як паведаміў "Інтэрфаксу" прадстаўнік Генпракуратуры, наглядчыкі, загадчыкі могілак атрымлівалі, а часта і вымагалі грошы за адведзенне месца для пахавання.

Народная Воля http://www.nv-online.info
28 ЖНІЎНЯ 2008 г.

Чем удивят "Навінкі?"

С 29 по 31 августа в столичном Дворце искусств пройдет Международный фестиваль перфоманса "NAVINKI-2008".

На "NAVINKI-2008" приедут художники-артисты из Германии, Японии, Сингапура, Польши, Швеции, Швейцарии, Великобритании, США и Австралии.

Перфоманс по-белорусски покажут **Виктор Петров, Дмитрий и Татьяна Майборода, Александр Сарна, Наталья Лисовская, Сергей Жданович, Юрась Барысевич и Николай Дранич.**

"Также у нас будут проходить три мастер-класса с девятью художниками из разных стран-участников, — рассказал "Народной воле" куратор фестиваля **Денис Романовский**. — *Примечательно и то, что наши зрители смогут поучаствовать в этих мероприятиях".*

Самым интересным моментом работы фестиваля Денис Романовский считает уникальную возможность контакта с художниками.

"На протяжении 10 лет своего существования наш фестиваль очень востребован, — объясняет Роман. — *Формат перфоманса, как искусства, живущего непосредственно в момент своего создания, дает возможность близко познакомиться с художниками и присутствовать при процессе творчества. Это привлекает широкий круг людей...Также нам приятно, что на наших фестивалях выросло много белорусских художников, которые уже ездят по фестивалям других стран, представляя себя и белорусский художественный контекст в целом".*

Кстати, "NAVINKI" — единственный белорусский фестиваль перфомансов.

Ольга ПРУДНИКОВА.

Маска д'ябла з ашчэранымі іклямі сімвалізуе раўнівую жонку

Ці ведаеце вы, што маска д'ябла з ашчэранымі іклямі ў японскім тэатры сімвалізуе разлаваную альбо раўнівую жонку? Гэты яскравы экспанат — толькі адзін са шматлікіх прадметаў, якія склалі выставу "Загадкавая Японія" ў Літаратурным музеі Віцебска. Акрамя традыцыйных тэатральных масак, тут можна бачыць рытуальныя лялькі, узоры нацыянальнай вопраткі і — самае, бадай, цікавае — дыярыуш 12 помнікаў сусветнай спадчыны, занесеных у ахоўны спіс ЮНЕСКА.

Палескі акцэнт Джона Кундстатара

Людзі ў акалічнасцях рэальнага жыцця беларускай "глыбінкі" — тэматыка фотавыставы "Палескія закосы", што працуе ў пастаўскім Доме рамёстваў.

Выстава, па-сутнасці, персанальная, бо аўтар усіх здымкаў — адзін чалавек — амерыканец Джон Кундстатар. Заўзяты аматар фатаграфіі, ён у мінулым быў прафесійным дыпламатам, працаваў у Турцыі, Балгарыі, Беларусі. З усіх краін знаходжання Джон найбольш упадабаў нашу, бо лічыць яе надзвычай прыгожай, а народ — мудрым і ветлівым, псіхалагічна падобным на правінцыйных амерыканцаў.

У фатаграфічнай тэхналогіі Д.Кундстатар — традыцыяналіст да такой ступені, што яго можна лічыць і кансерватарам, і прадстаўніком авангарду. У адрозненне ад большасці сваіх сучасных калег, Кундстатар карыстаецца не лічбавай тэхнікай, а стужкавай нямецкай камерай "Лейка" (механічны апарат кшталту савецкіх "Зоркага" альбо "Кіева". — **Аўт.**) і робіць выключна чорна-белыя адбіткі. А яшчэ Д.Кундстатара можна палічыць за беларуса, бо цягам знаходжання ў нашай краіне ён вывучыў мову тытульнай нацыі і размаўляе на ёй нязмушана, хораша і нават з няўлоўным палескім акцэнтам.

"Калі я пакідаю Беларусь, мне дрэнна, а калі вяртаюся, то зноў добра", — прызнаўся фотамайстар на адкрыцці выставы, якую ладзілі аддзел культуры Пастаўскага райвыканкама і беларускае Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

СЯМЕЙНЫ АЛЬБОМ

Уладзімір АРЛОЎ:

«Аднойчы я нават прываражыў адну дзяўчыну...»

Днямі Уладзімір Арлоў, беларускі "пісьменнік з гістарычнай адукацыяй", як ён сам сябе называе, адсвяткаваў 55-гадовы юбілей. "Народная воля" павіншавала літаратара і пагартала разам з ім сямейны фотаальбом.

— Калісьці ў вашым родным Полацку хацелі знесці дом. І вы наладзілі кругласутачнае дзяжурства каля яго...

— І як ні дзіўна для сённяшніх часоў, тады, у канцы 80-х, нам з сябрамі гэта ўдалося — дом не знеслі, там цяпер мастацкая школа. Калі прыязджаю дамоў, выратаваны дом цешыць маё вока і маю душу.

— А ці былі ў вашым жыцці дзяжурствы пад вокнамі каханай?

— Дзяжурстваў наладжваць не прыходзілася — удавалася неяк хутчэй паразумецца (смяецца).

Але былі свае прыколы. Каля дома адной дзяўчыны, з якой мы тады разам вучыліся ў 10-м класе, стаяла тэлефонная будка, з якой я ёй званіў і ад радасці, што чую яе, крычаў так, што яна мне казала: "Я цябе чую і без тэлефона".

А неяк я нават прываражыў адну дзяўчыну. У маёй бабы Грыпінкі, якая адсядзела ў 1930-х гадах за знахарства, была кніжка па чорнай магіі. Там былі рэцэпты на любы выпадак жыцця. Я паспрабаваў прываражыць з дапамогай чорнай магіі дзяўчыну, якая мне падабалася... І атрымалася! Потым мы разам рабілі, часам нават небяспечныя, эксперыменты з гэтай кнігай.

— У кожнага творцы ёсць свая муза. У вас іх многа?

— Адной з маіх музаў з'яўляецца Дзвіна, якая вучыла мяне плаваць і якая ўспрымалася мной у дзяцінстве амаль як адухоўленая істота. Ёсць яшчэ лясное возера Люхава каля Наваполацка. Возера цяжка назваць музай, аднак яно таксама мяне вельмі натхняе. Але, безумоўна, сярод маіх музаў былі зусім рэальныя зямныя істоты (*усміхаецца*).

— Ужо сапраўднай легендай стала ваша фраза наконт першага кахання: "Я так кахаў гэтую дзяўчыну, што кожны раз, калі бачыў яе, маё сэрца адгукалася недзе ўнізе..."

— Я ранні хлопчык — мае першае каханне было ў першым класе. Гэта была дзяўчынка Ірачка, якая сядзела на першай парце, а я — за ёй. І я глядзеў на яе худзенькую шыйку з персікавым пушком і радзімкай, падобнай на камарыка, які заблытаўся ў гэтым пушку. Гэта было велізарнае шчасце — бачыць перад сабой гэтую шыйку. Але, на жаль, я быў пазбаўлены гэтага шчасця, бо часта хварэў. І калі сядзеў дома, то марыў, каб мая Ірачка патанула ў Дзвіне. Не, я не быў некрафілам — мне хацелася, каб у апошні момант я паспеў яе выратаваць, зрабіў ёй штучнае дыханне. І калі я ў сваіх мроях даходзіў да таго моманту, як я буду дакранацца да яе вуснаў, тады сэрца маё вырастала і пачынала блукаць па ўсім юным арганізме, адгукаючыся ў самых нечаканых месцах... І тады мая рука цягнулася да сшытка ў касую лінейку і хімічнага алоўка, якім я выпісваў свае першыя літаратурныя вопыты. А калі бацькі вярталіся з працы, то я ліхаманкава кідаў свае вершы ў печку і глядзеў, як яны ператвараюцца ў попел. Мне ўяўлялася, што паэзія — такая інтымная рэч, пра якую, акрамя аўтара, хіба толькі агню дазволена ведаць...

— Ваш бацька быў пракурорам і марыў, каб вы сталі хірургам. І дзеля гэтага ён выпіў нямала каньяку з адпаведнымі людзьмі. Аднак вы ўсё роўна пайшлі на гістарычны факультэт БДУ. Сваім дзецям вы дазваляеце самастойна выбіраць свае шляхі ці займаецеся "дыктатарствам"?

— Мы с жонкай выказваем павагу да іх імкненняў. Калі Багдан спакойна скончыў Лінгвістычны універсітэт, то Раман доўга шукаў сябе. Ён паспеў павучыцца на філфаку БДУ, потым у Лінгвістычным універсітэце на англійскім аддзяленні, а затым нарэшце скончыў Універсітэт культуры. Нягледзячы на тое, што ў яго былі перыяды, калі ён наогул нідзе не вучыўся, у нашай сям'і ніколі не было ніякіх прымусаў і тлумачальнай працы.

Зараз Раман — гітарыст і аўтар песень гурта "J-Морс". Багдан — перакладчык з іспанскага, футбольны аглядальнік, стваральнік інтэрнэт-рэсурсу match.by.

— Якія святы абавязкова ўшаноўваюцца ў вашым доме?

— Дзень шлюбу, дні нараджэння. Таксама для нас свята — 25 сакавіка. Пакуль, як і шмат беларусаў, мы святкуем яго не так, як хочацца — калі ў гэты дзень выходзіш з дому, то не ўпэнены, ці вернешся. 25 сакавіка 2006 года пачалося з таго, што мы з жонкай панеслі перадачу Багдану, які сядзеў у турме пасля разгону намётавага гарадка на плошчы Каліноўскага...

Абавязкова святкуем Каляды, Вялікдзень, "Дзяды", Радаўніцу. Кожны год якраз перад "Дзядамі" і Радаўніцай мне пачынаюць сніцца бацькі, бабуля... Для мяне аксіёмай з'яўляецца тое, што мы маем сувязь з тымі, хто ўжо на іншым свеце.

— Гавораць, што вы лёгка пераплываеце раку ў 15 кіламетраў — на гэта не кожны юнак здольны... Як падтрымліваеце добрую фізічную форму?

— Я сапраўды магу плаваць на доўгія дыстанцыі. Плаваю даволі рэгулярна. Нядаўна плаваў у сваім любімым возеры Люхаве. Калі лета канчаецца, то плаваю ў басейне. Аднак лічу, што здольнасць адчуваць сябе камфотна ў вадзе — прыродная. Таму не абавязкова для гэтага падтрымліваць фізічную форму.

— Вы носіце вельмі прыкметны пярсцёнак з хрызапразам, што зрабіў ювелір Мікола Кузьміч, рэстаўратар крыжа Еўфрасінні Полацкай. Вы любіце насіць ювелірныя вырабы?

— Да гэтага пярсцёнка ніколі не насіў ніякіх ювелірных вырабаў і быў здзіўлены, як хутка ён стаў амаль часткай маёй істоты. Аднойчы ў поездзе да Ла-Маншу вечна п'яны расійскі праваднік Коля спрабаваў мой пярсцёнак "прыватызаваць". Калі ў пошуках пярсцёнка я прыйшоў у купэ праваднікоў, то ён нібыта мне даслаў сігнал з кішэні гэтага Колі. Я папрасіў яго вывернуць менавіта левую кішэню, Коля нават змяніўся ў твары, пярсцёнак вярнуў, а потым казаў, што гэта такі жарцік быў...

Неяк мяне спрабавалі абрабаваць і менавіта ўдар рукі з пярсцёнкам дапамог вырваца з лапаў злодзеяў. Потым, праўда, пярсцёнак давялося рэстаўраваць...

Яшчэ часта кажу на літаратурных сустрэчах, што я ім чытачак прыяблёваю (*смяецца*).

— Вы распавядалі, што калі ў дзяцінстве ваша маці пякла булачкі з разынкамі, вы любілі выкалупліваць гэтыя "вочкі" — была асалода ад парушанай забароны. Любіце парушаць забароны?

— Літаратар проста асуджаны на парушэнні правілаў, канонаў, забаронаў. Інакш ён не створыць нічога вартага ўвагі чытача.

Вольга ПРУДНІКАВА.

З жонкай Валянцінай — паэтэсай, журналісткай, аўтаркай пяці кніг — мы вучыліся ў адной групе на гістарычным факультэце БДУ. Закаханасць з'явілася не адразу — курсе на чацвёртым. У нас было два вяселлі: адно "гарадское" — у Наваполацку, другое "вясковае" — у Валяцініных Смалячах на Нясвіжчыне, дзе мы гулялі тры дні.

Вова Арлоў навучыўся стаяць...

З бацькамі і сястрой Таняй. Тата Аляксей быў пракурорам, мама Марыя — выкладчыцай гісторыі. Сястра зараз працуе эканамістам на творчым аб'яднанні "Палімер" у Наваполацку і захоўвае бацькоўскую кватэру, куды я магу заўсёды прыехаць і пасядзець у сваім улюбёным скураным крэсле.



У будатрадзе ў Сібіры. Менавіта з той паездкі вырасла мая "Сібірская аповесць", якую адзін крытык ахарактарызаваў як "чорны рэалізм"...



"Дзяды" 1988 года. Я выступаў на мітынгу на дарозе на Курапаты. Праз некалькі хвілін прагучыць каманда "Рассекай!" і на ўдзельнікаў маніфестацыі накінуцца салдаты ўнутраных войск і міліцыя. Справа — Зянон Пазьняк. Трэці злева — Алесь Асташонак.

«Я марыў, каб мая Ірачка патанула ў Дзвіне. Не, я не быў некрафілам — мне хацелася, каб у апошні момант я паспеў яе выратаваць, зрабіў ёй штучнае дыханне. І калі я ў сваіх мроях даходзіў да таго моманту, як буду дакранацца да яе вуснаў, тады сэрца маё вырастала і пачынала блукаць па ўсім юным арганізме, адгукаючыся ў самых нечаканых месцах...»

На магіле Карла Маркса ў Лондане з сябрам ладзілі перформанс, які называўся "Капіталісты ўсіх краін, яднайцеся". Мы газеткай заслалі п'едэстал, нарэзалі беларускага сальца і выпілі за капіталістаў. Кветкі ўскладалі не мы, а дэлегацыі, якія бесперапынна ішлі да помніка — кітайцы, карэйцы. Мы доўга чакалі, перш чым засталіся на 10 хвілін адны...



Мы з жонкай Валянцінай і сынам Раманам. Багдана на гэтым фотаздымку няма, але ён ужо ў праекце.

РЭГІЁН

У Гродне адкапалі чалавечыя парэшткі

Пры правядзенні будаўнічых работ у Гродне знойдзены чалавечыя парэшткі. Не выключана, што яны належаць вайскоўцам польскай арміі, якія абаранялі горад ад савецкай акупацыі ў верасні 1939 года.

Парэшткі знойдзены на тэрыторыі былога тонкасуконнага камбіната, дзе бягучым часам ажыццяўляюцца працы па рэканструкцыі будынкаў. Плануецца, што неўзабаве тут будуць функцыянаваць новыя карпусы Гродзенскага універсітэта і забаўляльны цэнтр. Працы ажыццяўляе будаўніча-мантажны трэст №30. Менавіта супрацоўнікі гэтага прадпрыемства падчас земляных работ і знайшлі парэшткі.

Быў таксама знойдзены падземны ход, які па загадзе кіраўніцтва працоўныя засыпалі. Чалавечыя парэшткі склалі ў два мяхі, і супрацоўнікі міліцыі звезлі іх у невядомым накірунку. Па загадзе кіраўніцтва прадпрыемства будаўнічыя работы не спыняліся, а факт знаходжання парэшткаў працоўныя пад пагрозай звальнення абавязаны захоўваць у тайне.

Краязнаўцы не выключаюць, што парэшткі належаць салдатам і афіцэрам войска польскага, якія ў верасні 1939 года баранілі Гродна ад бальшавіцкай навалы. Тым больш што гэта далёка не першы выпадак, калі падчас будаўнічых работ у гэтым месцы знаходзяць парэшткі. Мясцовыя ўлады не зацікаўлены ў тым, каб выпадак набываў грамадскі рэзананс, тым больш што ў наступным годзе будзе адзначацца 70-годдзе акупацыі Прынёмання савецкімі войскамі.

Створым музей разам

Супрацоўнікі Лагойскага гісторыка-краязнаўчага музея імя Канстанціна і Еўстафія Тышкевічаў у Мінскай вобласці просяць грамадскасць аказаць садзеянне ў аднаўленні экспазіцыі Лагойскага музея старажытнасцей, паведаміў у інтэрв'ю БелаПАН старшы навуковы супрацоўнік музея Віктар Несцяровіч.

Паводле яго слоў, археолагі, гісторыкі і этнографы браты Тышкевічы ў 1842 годзе стварылі ў сваім радавым маёнтку Лагойскі музей старажытнасцей — першы музей у Беларусі. Яго экспазіцыя размяшчалася ў двухпавярховым каменным палацы ў стылі класіцызму, збудаваным у 1818—1819 гадах у парку пейзажнага тыпу на паўночнай ускраіне Лагойска. У фондах музея захоўваліся унікальныя рэчавыя, пісьмовыя і выяўленчыя рэліквіі: калекцыі ўзбраення, нумізматыкі і твораў выяўленчага мастацтва, старажытныя рукапісы і карты, а таксама прыкладна 3 тыс. кніг, у тым ліку каля 500 помнікаў айчыннага кнігадрукавання. У 1855 годзе на базе гэтых фондаў браты Тышкевічы заснавалі Віленскі музей старажытнасцей, закрыты царскімі ўладамі ў 1864 годзе.

Як зазначыў В.Несцяровіч, з 2005 года вядзецца работа па фарміраванні фондаў Лагойскага гісторыка-краязнаўчага музея імя Канстанціна і Еўстафія Тышкевічаў, якія ўключаюць каля 6 тыс. рэчавых, пісьмовых і выяўленчых рэліквій. "Аднак пакуль мы маем толькі два польскамоўныя выданні, якія знаходзіліся ў фондах Лагойскага музея старажытнасцей, — справаздачу аб археалагічных даследаваннях братоў Тышкевічаў з малюнкамі экспанатаў музея і зборнік прозы пісьменніка Юзэфа Крашэўскага", — сказаў В.Несцяровіч.

Паводле яго слоў, перад супрацоўнікамі музея стаіць задача па стварэнні экспазіцыі, якая магла б перадаць дух эпохі сярэдзіны XIX стагоддзя. Музей закупляе старажытныя рэчы, мэблю і кнігі, фотаздымкі і нумізматычныя матэрыялы, а таксама творы жывапісу і скульптуры сучасных майстроў, якія ўзнаўляюць вобразы братоў Тышкевічаў і іх сучаснікаў.

Пакуль музей займае памяшканні плошчай каля 240 квадратных метраў у Лагойскім цэнтры культуры. Аднак супрацоўнікі музея спадзяюцца, што з часам установа культуры вернецца ў аднаўлены будынак палаца Тышкевічаў, разбураны ў гады Другой сусветнай вайны.

Усім жадаючым дапамагчы ў фарміраванні экспазіцыі музея прапануецца звяртацца па тэлефоне 8-01774-53-8-42 і па адрасе электроннай пошты log-museum@mail.by.

МІНУЛАЕ

Прывітанне з эпохі вікінгаў

Пад Магілёвам знойдзена гандлёва-рамеснае пасяленне эпохі вікінгаў. Пра гэта БелаПАН паведаміў загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Магілёўскага дзяржуніверсітэта імя А.Куляшова доктар гістарычных навук Ігар Марзалюк.

Паводле яго слоў, археалагічны ансамбль плошчай некалькі гектараў уключае селішча (рэшткі старажытнага неўмацаванага пасялення) і гарадзішча (рэшткі старажытнага ўмацаванага пасялення або горада) з "магутным культурным слоем" другой паловы X—XI стагоддзяў, а таксама курганны ансамбль.

Даследаванне 13 курганоў паказала, што ансамбль датуецца канцом X—XI стагоддзямі (эпоха праўлення кіеўскага князя Уладзіміра і яго жонкі Рагнеды — дачкі полацкага князя Рагвалода). Ён з'яўляецца першым дружынным могільнікам гэтага перыяду, выяўленым і зафіксаваным у рэгіёне Верхняга Падняпроўя. "Усе мужчынскія пахаванні могільніка належалі дружыннікам, а жаночыя — іх жонкам. Сярод дружыннікаў — прадстаўнікі славянскіх плямёнаў крывічоў і радзімічаў, а таксама варагаў з узбраеннем — тыповым для скандынаваў кап'ём з ланцэтападобным навершнікам. Прычым усе воіны былі пахаваны з дружыннымі наборнымі паясамі з накладкамі. Усяго знойдзены чатыры поўныя паясы бронзавага ліцця і некалькі фрагментаў гэтых высокамастацкіх ювелірных вырабаў. У багатых жаночых пахаваннях знойдзены разны скандынаўскі чарапахавы грэбень, фібулы (для зашпільвання адзення ў старажытных народаў), скроневыя кольцы, шкляныя пацеркі з залатой фольгай, а таксама шыйныя бронзавыя грыўны з засцёжкай у выглядзе воўчага ікла. У падоўжаным кургане лодкападобнай формы ляжалі астанкі дружынніка і яго жонкі", — сказаў вучоны.

Паводле яго слоў, вывучэнне курганоў паказала, што ў іх пахаваны ахвяры бітвы — пра гэта сведчыць наяўнасць мноства пасечаных касцей. "Перамогу атрымалі дружыннікі, бо толькі пры такім зыходзе схваткі яны маглі пахаваць сваіх таварышаў згодна са складаным пахавальным рытуалам", — зазначыў І.Марзалюк.

У пахаваннях знойдзена таксама мноства гаршчкоў з выявамі свастыкі — салярнага знака і элемента арнамента ў мастацтве старажытных культур, а таксама трызубца — сімвала князя Уладзіміра.

Марат ГАРАВЫ.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Сказ Сяргея Чыгрына пра нашых землякоў

Зусім нядаўна ў выдавецтве "Беларускі кнігазбор" выйшла кніга Сяргея Чыгрына "Беларуская Беласточчына", якая, несумненна, спадабаецца прыхільнікам творчасці гэтага таленавітага чалавека. Хачу крыху расказаць пра яго. Сяргей Чыгрын — беларускі паэт, літаратуразнавец, гісторык, краязнавец, перакладчык, журналіст. Сябра Саюза Беларускіх пісьменнікаў і Беларускай асацыяцыі журналістаў. Жыве ў Слоніме.

Ён нарадзіўся 24 верасня 1958 года ў вёсцы Хадзявічы Слонімскага раёна. Скончыў тэатральнае аддзяленне Магілёўскага культасветвучылішча і філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Працуе намеснікам галоўнага рэдактара "Газеты Слонімскай" і загадчыкам літаратурнай часткі Слонімскага драматычнага тэатра.

Выдаў зборнік паэзіі "Шчырая Шчара", "Горад без цябе, "Лірыка", кнігі гісторыка-краязнаўчых артыкулаў "Янка Купала і Слонімшчына", "Пакліканыя на родны парог", "Чамяры і Чамяроўцы", "У пошуках Слонімскіх скарбаў", "Тэатр у Слоніме".

Уклаў і выдаў у Беластоку літаратурную спадчыну С.Грынкевіча, Ф.Грышкевіча, У.Казлоўшчыка ("Вяртанне да сваіх"), а таксама гістарычныя нарысы М.Шкялёнка ("Беларусь і суседзі").

Дзесяцігоддзямі замоўчваліся імёны многіх беларускіх дзеячаў, у тым ліку заходнебеларускіх, якія не прызнаваліся ні савецкай, ні польскай афіцыйнай прапагандай. "Ніва" на сваіх старонках паступова вяртала іх з забыцця, узнаўляла іх ідэі і дасягненні ў свядомасці беларускай грамадскасці Беласточчыны. У 1984 годзе да кола ніўскіх аўтараў далучыўся слонімскі журналіст, краязнавец і літаратар Сяргей Чыгрын. У выніку шматгадовага супрацоўніцтва з тыднёвікам "Ніва" з'явілася рубрыка "Родам з Беласточчыны", у якой аўтар знаёміў і знаёміць цяпер з беларускімі палітычнымі, рэлігійнымі, культурнымі дзеячамі, таленавітымі літаратарамі, якія нарадзіліся на Беласточчыне або былі звязаны з Беласточчынай і сумежнай Гродзеншчынай. Гэтыя артыкулы, а таксама дапоўненыя, і склалі кнігу "Беларуская Беласточчына". "Яна — доказ жывучасці беларускай ідэі не толькі на этнічнай Бацькаўшчыне, але і па-за яе межамі, у тым ліку і сярод беларускага насельніцтва Беласточчыны", — піша ў сваёй прадмове да кнігі Віталь Луба — намеснік галоўнага рэдактара тыднёвіка беларусаў у Польшчы "Ніва".

Вось што піша ў сваёй кнізе Сяргей Чыгрын пра Янку Геніюша: "Пра беларускую паэтку Ларысу Геніюш у нас напісана даволі шмат. А вось пра Янку Геніюша, яе мужа, чамусьці нашы даследчыкі літаратуры і гісторыі згадвалі мала. А ў 2002 годзе яму споўнілася б сто гадоў з дня нараджэння. Але аб гэтым юбілеі беларускага доктара, бібліяфіла, палітыка, мужа паэткі Ларысы Геніюш ніхто не ўспомніў ні ў Беларусі, ні на яго радзіме — Беласточчыне.

Па характары Іван Пятровіч быў розны — то спакойны, то занадта рэзкі і гарачы ў выказваннях, то чулліва-лагодны, то вясёлы. Але найперш да канца сваіх дзён ён быў і застаўся шчырым беларусам, патрыётам сваёй Бацькаўшчыны. Тым больш што побач з ім, нягледзячы на ўсе пакуты, цяжкасці і шматгадовыя ростані, была слынная паэтка Беларусі Ларыса Геніюш. Яны разам дзялілі гора і радасці, здзекі і хваляванні, трывогу і неспакой. На магільным помнічку ў Зэльве, які ставіла сама Ларыса Антонаўна (цяпер ім дваім творчая інтэлігенцыя Беларусі паставіла новы помнік на Зэльвенскіх могілках), былі выбіты такія радкі:

Па сонца асветы ўзлятаў, нібы птах,
З палоскі сялянскае, вузкае.
Адзін толькі ведаў ў жыцці сваім шлях
Пачэсны, цяжкі, беларускі.

Янка Геніюш нарадзіўся 24 лютага 1902 года ў Крынках на Беласточчыне. З Крынак шлях ляжаў у Прагу, куды Янка Геніюш прыехаў вучыцца. Ён паступіў у Пражскі універсітэт, а пасля яго заканчэння атрымаў медыцынскую адукацыю, стаў урачом-венеролагам. У тым жа 1935 годзе ў Геніюшаў нарадзіўся сын Юрка. Пабыўшы два гады дома, Ларыса з сынам пераязджаюць у Прагу да Янкі. Аўтар піша, што гэты цікавы чалавек быў сябрам пражскага камітэта беларускай народнай самапомачы.

Пасля вайны ў 1948 годзе Янка і Ларыса Геніюшы былі незаконна пазбаўлены чэшскага грамадзянства і з Прагі іх вывезлі ў Беларусь. А праз год асуджаныя Вярхоўным судом Беларусі на 25 гадоў няволі. У 1956 годзе Геніюшы былі датэрмінова вызвалены і вярнуліся ў Зэльву. У іх хаце часта гасцілі Уладзімір Караткевіч, Алег Лойка, Данута Бічэль, Юрка Голуб і многія іншыя пісьменнікі і сябры. Па-рознаму яны адносіліся да Івана Пятровіча, які пасля сталінскіх лагераў ненавідзеў бальшавікоў і савецкую ўладу, а яшчэ мацней любіў Беларусь і ўсё жыццё марыў аб яе незалежнасці.



А вось што піша Сяргей Чыгрын пра пісьменніка Аляксея Карпюка: "Нарадзіўся Аляксей Карпюк у 1920 годзе на Беласточчыне ў вёсцы Страшава ў сялянскай сям'і. Скончыў мясцовую сямігодку, вучыўся ў польскай гімназіі ў Вільні. У гады вайны пайшоў у партызаны, а ў час выканання дыверсіі на чыгунцы каля Ваўкавыска трапіў у палон. Потым уцёк з лагера, арганізаваў партызанскі атрад і стаў камандзірам. Праз пэўны час разам з дзеючай арміяй прымаў удзел у вызваленні Варшавы, Познані, штурме Берліна.

Пасля вайны паступіў на факультэт замежных моў Гродзенскага педінстытута. Пасля вучобы працаваў загадчыкам райана ў мястэчку Сапоцкіна, дырэктарам школы ў Ваўкавыскім раёне, супрацоўнікам Гродзенскага педінстытута, у рэдакцыях газет, загадчыкам агенцтва "Інтурыст" у Гродне, дырэктарам Музея атэізму і гісторыі рэлігіі, узначальваў Гродзенскае аддзяленне Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Жылося яму нялёгка. Ён быў адкрытым і смелым, а чыноўнікі і камуністы не любілі такіх.

Ёсць у Аляксея Карпюка аўтабіяграфічны нарыс "Мая Джамалунгма". Пра гэты выдатны твор пісала нават газета "Бацькаўшчына", якая выдавалася ў Мюнхене. Але, бадай, самым знаным і папулярным творам застаецца яго аповесць "Данута", якая перакладзена на многія мовы свету. Зянон Пазьняк назваў "Дануту" Аляксея Карпюка сваёй любімай аповесцю.

Аляксей Карпюк пакінуў нашчадкам і раман "Карані", аповесці, казкі, а таксама нарысы, прысвечаныя Гродзеншчыне і яе людзям".

Пэўнае месца ў кнізе аддадзена разьбяру па дрэве з Дзятлава Уладзіміру Мацюку (1902—1989). Яго працы знаходзяцца ў Дзятлаўскім краязнаўчым музеі, а таксама ў Расіі ў Дзяржаўным музеі этнаграфіі ў Санкт-Пецярбургу і ў музеях Рэспублікі Беларусь.

"Уладзімір Мацюк нарадзіўся ў Беластоку. У сярэдзіне 40-х гадоў не па сваёй волі з сям'ёй прыйшлося пакінуць родныя мясціны і пераехаць у Дзятлава. Асноўная тэматыка яго твораў (рэльеф, круглая скульптура) — гэта гісторыя беларускага народа, яго сялянская праца, да якой мастак быў бліжэй і добра ведаў. Сама скульптурная прапрацоўка формы ў работах Уладзіміра Мацюка вылучаецца мноствам дробных парэзаў, якія дапамаглі мастаку выявіць пластыку фігур", — піша пра таленавітага творцу Сяргей Чыгрын.

У сваёй кнізе ён піша таксама пра Зоську Верас, Аляксея Грыцука, Петруся Макаля, Піліпа Пестрака і многіх іншых славутых беларусаў. Кніга багата ілюстравана. Пачытайце — не пашкадуеце.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Разбудзіце іх...

Чаму ў нашай краіне столькі праблем? Таму што ў нас шмат людзей, якім на ўсё, прабачце, напляваць. Іх абыякавасць — вынік дрэннага выхавання, нізкага ўзроўню адукацыйнасці, цемрашальства.

Не чытаюць такія людзі "Народную волю". А давайце ім дапаможам. Разбудзім іх! Пераканаем, зробім спецыяльна за іх **перадаплату** за нумары ў верасні — снежні. Калі ёсць магчымасць, ахвяруйце для іх невялікую суму. Зрабіце гэта ў бліжэйшыя дні. Для гэтага зазірніце ў любы філіял "Беларусбанка" ці наведайце бліжэйшае паштовае аддзяленне. Мінчане могуць апаратыўна зрабіць **перадаплату** таксама праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 328-63-93 ці 328-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін і па любым адрасе. Не маеце магчымасці аплаціць за ўсе нумары, якія выйдуць у верасні - снежні — зрабіце гэта за месяц, два, тры...

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па перадаплаце ранейшыя: на месяц — 9500 рублёў для індывідуальных чытачоў і 15.000 рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з новага года павысіўся, то выгадна рабіць перадаплату, з тым каб газета дастаўлялася дахаты.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

0402280179

ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя **3012006535014** Лицевой счет **код 749**
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г. *(ненужное зачеркнуть)*				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя **3012006535014** Лицевой счет **код 749**
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г. *(ненужное зачеркнуть)*				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир **М.П.**

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов.

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия

имя **отч.**

индекс почтового отделения

область

район

название населенного пункта

город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)

улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*

дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: если можете — укажите, пожалуйста, код подъезда или номер дом.телефона; в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

З дапамогай "Народнай волі" разбудзім усіх абыякавых!

ЗНАХОДКІ

Шклоў аказаўся старэйшы, чым многія думалі

Па выніках раскопак каля вёскі Стары Шклоў у Шклоўскім раёне горад Шклоў можа "пастарэць" на 400 гадоў, лічыць загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя Аркадзя Куляшова доктар гістарычных навук Ігар Марзалюк.

У рамках летняй комплекснай экспедыцыі 2008 года з удзелам студэнтаў ВНУ і навуковых супрацоўнікаў Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі праводзілася археалагічнае даследаванне абарончых збудаванняў Старога Шклова. "У выніку можна зрабіць выснову, што замкавым умацаванням у Старым Шклове папярэднічала гарадзішча (старажытнае ўмацаванае пасяленне) V—VII стагоддзяў нашай эры", — паведаміў археолаг.

Паводле яго слоў, ад агароджанага звычайным драўляным плотам пасялення, дзе жылі прадстаўнікі калочынскай археалагічнай культуры плямёнаў жалезнага веку, Стары Шклоў прайшоў шлях да замка з магутнымі драўняна-землянымі ўмацаваннямі ў другой палове X стагоддзя, сказаў вучоны.

Радыевуглядродны аналіз попелу з рытуальных вогнішчаў каля аснавання абарончага вала дапамажа ўстанавіць дакладную дату заснавання Старога Шклова, зазначыў І. Марзалюк. Сярод найбольш цікавых археалагічных знаходак гэтага сезона ён назваў наканечнікі стрэл IX—X стагоддзяў, рэшткі сцен жылых будынкаў XV — першай паловы XVI стагоддзяў з фрагментамі печы з гаршчковай кафляй, донцы якіх кляймёныя гербам Полацкага княства і гербам канцлера Вялікага княства Літоўскага, уладальніка Старога Шклова Альбрэхта Гаштольда.

Марат ГАРАВЫ.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. **Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. По заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 27.08.2008 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №**